*В.І.Стражаў,*
*міністр адукацыі*

# Ў добры шлях!

У час рэфармавання ўсяго грамадскага развіцця і адукацыйна-выхаваўчай сістэмы адбылася знамянальная падзея ў выдавецкай справе: заснаванне навукова-метадычнага часопіса "Гісторыя: праблемы выкладання". Дазвольце выказаць надзею, што новае выданне зойме адпаведнае месца ў вырашэнні праблем выкладання гісторыі, якія паўсталі перад гістарычнай адукацыяй і грамадствам.

Стварэнне часопіса — гэта крок наперад у спалучэнні тэорыі гістарычнай навукі, вопыту выкладання і выхавання маладога пакалення. Выкладчыкі сярэдняй і вышэйшай школы будуць мець магчымасць карыстацца здабыткам індывідуальнага вопыту, які з'яўляецца невычарпальнай крыніцай агульных намаганняў у дыдактыцы гісторыі. Разам з тым, часопіс павінен адыграць значную ролю ў павышэнні навукова-метадычных ведаў настаўнікаў. Распрацоўка новых даследчых і педагагічных тэхналогій, дыдактычных сродкаў і іх укараненне ў выкладчыцкую справу — галоўны накірунак дзейнасці выдання.

Жадаю часопісу высока несці асветніцкія ідэі і плённай працы на гэтым вызначальным шляху.

Штоквартальны
навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842

**Выпуск 1 ' 97**
**I квартал**

# ГІСТОРЫЯ:
## праблемы выкладання



**Заснавальнік і выдавец —**
рэдакцыя часопіса
"Адукацыя і выхаванне"

*Галоўны рэдактар*
**У.П.Пархоменка**

**Рэдакцыйная калегія**

*Галоўны рэдактар*
М.І.Мініцкі
*Намеснік галоўнага рэдактара*
Н.М.Ганушчанка
*Адказны сакратар*
Л.В.Саламаха

І.І.Багдановіч
С.К.Ганцова
Г.А.Космач
У.С.Кошалеў
С.В.Паноў
В.В.Сакалова
К.І.Сякацкая
У.В.Тугай
В.М.Фамін
В.М.Шутава

220004, г. Мінск,
вул. Караля, 16;
тэл.: 220-54-81, 220-54-10

Бібліятэка
БДПУ ім. М. Танка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

страчвалі сваё гандлёвае значэнне. Вытворчасць хлеба на продаж скарацілася ў рэспубліцы з 1923/24 па 1924/25 гаспадарчы год амаль у два разы. На столь ж павялічыўся ў 1927/28 г. увоз у БССР збожжавых у параўнанні з 1925/26 г. Не дзіўна, што калі ў выніку рынычных ваганняў узніклі цяжкасці ў забеспячэнні спажываючых раёнаў збожжам, рост цэн на хлебапрадукты замарудзіў працэс развіцця жывёлагадоўлі. Сялянства (галоўным чынам малазямельнае) перад пагрозай хлебнага голаду скараціла пасевы кармавых культур, частку статку і пашырыла пасевы збожжавых. Адразу ж за падаражаннем хлеба ўзраслі цэны і на бульбу. Гэта адбілася перш за ўсё на свінагадоўлі, а ў 1928 г. свініна складала 74 % усяго рэалізуемага ў краіне мяса.

У шэрагу прычын значнага скарачэння пагалоўя жывёлы трэба таксама адзначыць узмацненне падаткаабкладання сялянства рэспублікі. Яшчэ ў 1927 г. на VIII Усебеларускім з'ездзе Саветаў З.Прышчэпаў выказваў прапанову аб неабходнасці ўліку спецыфікі асобных сельскагаспадарчых рэгіёнаў краіны, аб тым, каб саюзны ўрад устанаўліваў толькі агульныя лічбы, прынцыпы сельгаспадатку, а апошнія б канкрэтызаваліся ўрадам рэспублікі. У 1927/28 г. частка серадняцкіх гаспадарак БССР, апынуўшыся перад фактам неабходнасці выплаты двайнога і трайнога падатку ў параўнанні з папярэднімі гадамі палічыла за лепшае ліквідаваць пэўную колькасць жывёлы з мэтай пазбегнуць такога абкладання ў далейшым. Адбываецца драбленне сялянскіх гаспадарак.

Такім чынам, можна зрабіць наступныя вывады. Па-першае, новая эканамічная палітыка на вёсцы пачала праводзіцца з 1921 г., але гаспадарчая сістэма НЭПа склалася толькі да 1925 г. Па-другое, новая эканамічная палітыка вызначылася не як "антысялянская", а як палітыка "адступленняў" ад "камунізму" да рэальных патрабаванняў жыцця і сялян. Галоўнымі з апошніх былі (і застаюцца) свабода распараджацца сваёй прадукцыяй, сваімі рабочымі рукамі, свабода выбару форм землекарыстання. Рынкавыя адносіны (пераўтварэнне ў тавар прадукцыі, рабочай сілы і г.д.) выклікалі (і выклікаюць) супярэчнасці. У 1920-ыя гг. яны адлюстроўваліся нават у палітыцы кіруючай партыі.



***Анатоль Жытко**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ імя М.Танка*

# Палітыка самадзяржаўя па абмежаванню землеўладання дваран-католікаў на Беларусі. 1861—1914 гг.

*З гэтым матэрыялам настаўніку і вучням карысна будзе пазнаёміцца пры вывучэнні ў XI класе сярэдняй школы тэмы 4 "Развіццё капіталізму і фармаванне класаў буржуазнага грамадства". Ён дапаможа глыбей зразумець рэакцыйную сутнасць царскай самадзяржаўнай улады, якая адмоўна паўплывала як на палітычнае, так і эканамічнае развіццё краю.*

Аснову капіталістычных адносін у сельскагаспадарчай вытворчасці складае зямля. Капіталізм канчаткова парывае з феадальнай патрыярхальнасцю, калі зямля становіцца аб'ектам вольнай куплі-продажу.

Да рэформы 1861 г. толькі патомныя дваране валодалі выключным правам на набыццё земляў, населеных прыгоннымі. На працягу 1861—1870 гг. быў выдадзены шэраг законаў, згодна якіх усе саслоўі атрымалі права вольнай куплі-продажу зямлі. Гэтыя акты заклалі аснову капіталізацыі сельскай гаспадаркі. Але яны не тычыліся землеўладання дваран-католікаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны.

У 1862 г. у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях пражывала 9929 дваран-памешчыкаў, з якіх 93,3 % з'яўляліся католікамі [14]. Царскі ўказ лічыў іх палякамі, хаця звыш паловы з іх адносілі сябе да беларусаў [1].

Актыўны ўдзел дваран-католікаў у паўстанні 1863 г. на доўгія гады прадвызначыў палітыку самадзяржаўя да гэтай часткі вышэйшага саслоўя ў Заходнім краі. Маёнткі ўдзельнікаў, якія былі асуджаны, канфіскоўваліся, а маёмасць высланых з краю па рашэнню адміністрацыі падлягалі секвестру.

На падставе закона ад 10 снежня 1865 г. уладальнікі секвестраваных маёнткаў, як і ўсе асобы, высланыя за ўдзел у паўстанні, павінны былі прадаць іх на працягу двух гадоў асо-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бам рускага паходжання праваслаўнага ці пратэстанцкага ве равызнання. Яны маглі абмяняць іх на маёнткі, якія знаходзі ліся на тэрыторыі вялікарускіх губерняў [8].

Секвестраваныя маёнткі, якія не былі прададзены па до браахвотным пагадненні, прадаваліся ўладамі з публічных тар гоў. У выпадку, калі апошнія не адбываліся, яны пераходзілі ў казну з выплатаю ўладальніку 5 % рэнты [9].

Пакупнікам даваліся значныя льготы. Так, калі маёнтак быў закладзены ў крэдытных установах альбо на ім ляжалі казённыя даўгі, пакупнік меў права ўзяць на сябе той ці іншы доўг у паме ры, не перавышаючым ацэначны кошт. Пры гэтым ён абязаны быў выплочваць першы па правілах, якія існавалі для крэдытных устаноў, а другі на працягу 37 гадоў, уносячы 6 % штогод [8].

У пяці беларускіх паветах Віцебскай губерні было кан фіскавана 17 маёнткаў (15 746 дзес. зямлі) і столькі ж сек вестравана (31 136 дзес. зямлі) [7]. У шасці паветах Гродзен скай губерні секвестру падлягалі 58 маёнткаў з агульнай плош чай зямлі ў 84 999 дзес. Усяго ж у пяці Паўночна-Заходніх губернях да казны адышло 256 канфіскаваных маёнткаў [19].

У 1866 г. было заснавана таварыства пакупнікоў маёнткаў у заходніх губернях з устаўным капіталам 5 млн р. Перад ім была пастаўлена задача ўраўняць у Заходнім краі рускае землеўладан не з мясцовым каталіцкім. Але справа практычна не рухалася, бо сярод асоб рускага паходжання амаль не знаходзілася жадаючых купляць землі з публічных таргоў. Таму секвестраваныя маёнткі пераходзілі пад юрысдыкцыю Міністэрства дзяржаўнай маёмасці, якое прадавала іх на больш ільготных умовах без таргоў. Такім чынам, міністэрства змагло прадаць казённай зямлі, фермаў і пры ватных маёнткаў плошчай 516 200 дзес. зямлі 1092 асобам [17].

У далейшым палітыка царызму ў адносінах да дваран-каталі каў рабілася больш жорсткай, а рускім землеўладальнікам прад стаўляліся новыя льготы. Справа ў тым, што планы па наса джэнню ў краі рускага землеўладання зрываліся. Камітэт Мініс траў, які прааналізаваў гэта становішча, прыйшоў да высновы, што адной з прычын такой з'явы былі пэўныя абмежаванні: за барона аддаваць купленыя маёнткі ў арэнду яўрэям і католікам і разам з гэтым мецъ іх у якасці ўпраўляючых. Таму з 1867 г. у маёнтках яўрэі маглі быць вінакурамі, арандатарамі карчмы, а таксама ўпраўляючымі мельніц і заводаў [2, *212—213*].

Для дваран-католікаў жа з'явіліся новыя абмежаванні ў зем леўладанні. 14 красавіка 1866 г. цыркулярам начальніка Паў ночна-Заходняга краю католікам, у якіх маёнткі былі секвестра ваны, забаранялася набываць нерухомасць у гарадах. Нават два ранам-католікам, якія перайшлі ў праваслаўе, з 1868 г. не дазва лялася купляць землі. З 17 кастрычніка 1869 г. такая забарона ўлатычылася і асоб пратэстанцкага веравызнання, што бралі шлюб з каталічкамі, у якіх дзеці былі рымска-каталіцкага веравызнан ня [13]. Напрыклад, у 1870 г. на падставе гэтага законапалажэн ня Віленскі генерал-губернатар адхіліў хадайніцтва на куплю зямлі буйному памешчыку Мінскага павета, уладальніку маёнт ка Станькава, двараніну-пратэстанту К.Гарцінгу [4].



У 1875 г. Камітэт Міністраў прааналізаваў вопыт дзейнас ці па ўкараненню рускага землеўладання і прыйшоў да несу цяшальных вынікаў. Ён вымушаны быў канстатаваць, што маёнткі, набытыя рускімі, прыйшлі да заняпаду, таму што ўладальнікі іх часта мяняліся, весці гаспадарку самастойна не жадалі [8, 278]. Пасля таго, як былі вычарпаны крыніцы льгот нага распродажу земляў (канфіскаваныя, секвестраваныя, казённыя), з 1887 г. Міністэрства дзяржмаёмасці перастала ўручаць пасведчанні на права атрымання льгот і пазык пры куплі зямлі ў Заходнім краі. Адначасова было скасавана і та варыства пакупнікоў маёнткаў [11].

Па закону ад 1 лістапада 1886 г. права выдачы пасведчан няў было перададзена генерал-губернатарам і губернатарам. Гэтая мера прывяла да неабмежаванага самавольства з боку губернатараў. Яны дзейнічалі паводле свайго меркавання, і іх рашэнні не маглі быць абскарджаны [13].

Дваране-католікі імкнуліся абысці абмежавальныя зако ны. Нярэдка яны набывалі землі на імя акцыянерных тава рыстваў альбо падстаўных асоб. Іншы раз яны давалі пазыкі рускім землеўладальнікам пад залог маёнткаў і па сутнасці станавіліся іх уласнікамі. Каб перакрыць і гэтыя каналы, па новых правілах ад 27 снежня 1884 г. забаранялася рабіць закладныя (пад залог маёмасці браць грошы ў прыватнай асо бы) на імя асоб польскага паходжання. Закладныя, зробле ныя да з'яўлення новых правіл, мелі сілу да заканчэння тэр міну, а бестэрміновыя — на працягу 10 гадоў [10].

Для акцыянерных кампаній і таварыстваў права набыцця зямельнай уласнасці ў Заходнім краі абмяжоўвалася памерам не звыш за 200 дзес. [10].

Іншча раз падкрэслівалася, што здача маёнткаў у арэнду католікам забараняецца. Хаця было адно выключэнне. Так, у

выпадку, калі арандатар-католік абяцаў на працягу першых 12 гадоў пабудаваць фабрыку ці завод у арэндуемым ім маёнтку, кантракт мог заключацца на тэрмін да 30 гадоў [10].

У 1891 г. у сувязі з тым, што дзеянні ўлад па насаджэнню рускага землеўладання ў краі не прывялі да станоўчых вынікаў, Камітэт Міністраў вырашыў зрабіць больш жорсткімі правілы 1884 г. З гэтага часу для католікаў-дваран забаранялася перадача маёнткаў у пажыццёвае ўладанне мужа ці жонкі, калі мелiся дзеці альбо іншыя спадчыннікі. Гэтае дапаўненне і правілы 1884 г. атрымалі сілу закона 2 лютага 1891 г. [3, *216*].

У сувязі з гэтай прапановай міністр фінансаў Бунге заназначыў: “Вынікі, каторых дасягнуў урад прынятымі мерамі, былі вельмі нязначнымі. Само абмежаванне дзейнасці палякаў на ніве дзяржаўнай службы засярoдзіла іх дзейнасць на гаспадарцы, якая бяспрэчна зрабіла вялікія поспехі і з нядбайнай панскай пераўтварылася ў эканамічную памешчыцкую” [3, *222*].

Вынікам усіх гэтых абмежаванняў з’явілася поўная забарона на землянабыццё для ўсіх асоб каталіцкага веравызнання, за выключэннем сялян. За апошнія 30 гадоў пасля прыняцця закона ад 10 снежня 1865 г. толькі некалькі хадайніцтваў дваран-католікаў былі задаволены з асабістага дазволу манарха. Абсалютная большасць такіх дваран асабіста займаліся гаспадаркай, некаторыя з іх атрымалі дазвол на набыццё зямлі за актыўны ўдзел у руска-турэцкай вайне 1877—1878 гг. [15].

Да канца XIX ст. у канцылярыі імператара такіх хадайніцтваў назбіралася вельмі шмат. Таму з 4 сакавіка 1899 г. міністру унутраных спраў было даручана разглядаць асабіста гэтыя справы і даваць дазвол на набыццё зямлі мясцовым ураджэнцам каталіцкага веравызнання, якія вялі сялянскі вобраз жыцця і самі гаспадарылі. Але колькасць зямлі, якая знаходзілася ва ўласнасці прасіцеля, разам з купленай не павінна была быць большай за 60 дзес на сям’ю [15].

Здавалася б, новыя правілы сталі некаторай ільготай у параўнанні з законам ад 10 снежня 1865 г. Аднак на самой справе атрымалася адваротнае, таму што па згаданаму закону забаранялася набываць землі асобам польскага паходжання, г.зн. у некаторых выпадках пад гэты абмежавальны закон не пападалі беларускія дваране-католікі, якія маглі купляць зямлю ў неабмежаваных памерах. Па новых жа правілах усім католікам, у тым ліку і беларусам, забаранялася набываць звыш 60 дзес.



Пазней пры міністры ўнутраных спраў Плевэ вобласць прымянення закона ад 4 сакавіка 1899 г. стала яшчэ больш абмежаванай. Плевэ вырашыў, што новы закон нясе небяспеку рускаму землеўладанню ў краі. Ён убачыў працэс нараджэння новага слаю дробных дваран-католікаў, якія былі варожа настроены супраць царскіх улад. Ужо з лютага 1903 г. па ініцыятыве Плевэ была часова прыпынена, за вельмі рэдкім выключэннем, выдача гэтай катэгорыі дваран пасведчанняў на куплю зямлі. Так, калі з 1866 да 1876 г. права на набыццё зямлі атрымалі 25 дваран-католікаў Мінскай губерні на агульную плошчу 105 435 дзес., то за 5 месяцаў 1904 г. — 6 дваран на 58 дзес. зямлі [18].

21 ліпеня 1904 г. Мікалай II зацвердзіў асноўныя палажэнні даклада Плевэ аб парадку набыцця зямлі католікамі ў Заходнім краі. Гэтыя палажэнні яшчэ больш абмяжоўвалі закон ад 4 сакавіка 1899 г. Так, цяпер зямельную ўласнасць католікі маглі набываць у наступных выпадках:

1. Набываемая зямля была пэўны час у фактычным валоданні пакупніка. І то пры ўмове, што яна была акультурана.
2. Жонка і дзеці прытрымліваліся праваслаўнай веры.
3. Зямля набывалася ў складзе таварыства. Пры гэтым апошнія члены таварыства ўжо атрымалі пасведчанні на права куплі зямлі ад мясцовых улад [16].

Такім чынам, новы закон практычна забараніў правы набыцця зямлі ў краі ўсімі католікамі, за выключэннем сялян.

Палітычныя падзеі буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, імкненне самаўладдзя абмежаваць сепаратызм дваран-палякаў, а таксама адарваць ад іх значную частку беларускіх дваран-католікаў прывялі да прыняцця новага закона 1 мая 1905 г.

На гэтаму закону асобы польскага паходжання маглі арандаваць у краі землі на тых жа падставах, што і рускія, без абмежавання тэрміну. Яны атрымалі правы і купляць землі ў пажыццёвае валоданне, але толькі ў палякаў, і браць іх у залог [12].

Асобы, якія лічыліся палякамі, з дазволу мясцовых вышэйшых улад маглі купляць землі не толькі ў палякаў, але і іншых нацыянальнасцяў у выпадках неабходнасці скасавання церазпалосіцы альбо гаспадарчага акруглення межаў уладання. Ім дазвалялася таксама набываць зямлю для прамысловых мэт, але не звыш 60 дзес. Пры гэтым драконаўскія палажэнні ад 1 лістапада 1886 г. аб парадку выдачы пасведчанняў адмяняліся [12].

Але з паражэннем першай рэвалюцыі, калі пагроза існаванню імперыі адпала, царскія ўлады пачалі абмяжоўваць іль-



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

готы, прадстаўленыя законам ад 1 мая 1905 г. Так, 4 лістапа да 1909 г. з боку МУС паследавалі тлумачэнні губернатарам аб парадку прымянення артыкула 3 названага закона, па яко му палякам дазвалялася купляць да 60 дзес. зямлі ў краі для будаўніцтва фабрык і заводаў. У гэтых тлумачэннях, у пры ватнасці, адзначалася, што закон ад 1 мая 1905 г. быў скіра ваны на задавальненне патрэб толькі мясцовай прамысловас ці, што не азначала даваць права кожнаму пажадаўшаму па ляку купляць землі з прамысловаю мэтаю. Апляценне Заход няга краю сеткаю "польскіх" гандлёва-прамысловых прадпры емстваў супярэчыла палітыцы ўрада. Таму прэм'ер-міністр П.А.Сталыпін зазначаў, што падобныя хадайніцтвы аб купл зямлі неабходна задавальняць "не ў інтарэсах прасіцеля, а мясцовых гандлёва-прамысловых патрэб. Пры атсутнасці ж у губернскага начальства поўнай перакананасці ў тым, што зямля набываецца менавіта для прамысловых мэт і што эк сплуатуемы промысел адказвае мясцовым патрэбам, я лічу больш асцярожным — узбуджаныя хадайніцтвы адхіляць. Агульнае накіраванне маёй думкі зводзіцца да наступнага — прымяненне артыкула 3 павінна быць не правілам, а выклю чэннем" [5].

У сувязі з тым, што ў законе ад 1 мая 1905 г. не канкрэ тызавалася, каго ж разумець пад тэрмінам "асоба польскага паходжання", Сенат 21 чэрвеня 1910 г. растлумачыў, што "пад выражэннем "асоба польскага паходжання" неабходна разумець не навогул католікаў, а толькі палякаў і тых заход ніх ураджэнцаў, якія засвоілі польскую нацыянальнасць" [6].

Такім чынам, закон ад 1 мая 1905 г. значна ўрэзваўся. Гэтыя тлумачэнні па сутнасці вярталі расійскае заканадаўст ва да сумнавядомага закона ад 10 снежня 1865 г.

Вынікам палітыкі царызму ў адносінах да памеснага два ранства каталіцкага веравызнання была кансервацыя феадаль ных форм землеўладання, пераразмеркаванне яго з рук като лікаў у рукі асоб рускага паходжання, у асноўным правасла ўных. Гэта не магло сказацца адмоўна на зямельных мабіліза цыйных працэсах, пераходзе ад саслоўнага да ўсесаслоўнага капіталістычнага землеўладання.


1. *Житко А.П.* Национальный состав дворянства Белоруссии по итогам Первой всероссийской переписи населения // Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў. Мінск, 3—5 лютага 1993 года.





2. Исторический обзор деятельности Комитета Министров. Спб., 1902. — Т. 3. — Ч. I.

3. Исторический обзор деятельности Комитета Министров. Т. 4.

4. НА РБ, ф. 295, воп. 1, спр. 1979, арк. 237—241.

5. НА РБ, ф. 1430, воп. 1, спр. 47 705, арк. 5—7.

6. НА РБ, ф. 1430, воп. 1, спр. 47 705, арк. 76.

7. НА РБ, ф. 2502, воп. 1, спр. 104, арк. 12—13; Памятная книжка Витебской губернии на 1866 год. Спб., 1866. — Ч. I. — 906—912.

8. ПСЗ. II. — Т. 40. — Отд. 2. — № 42759.

9. ПСЗ. II. — Т. 40. — Отд. 2. — № 42760.

10. ПСЗ. III. — Т. 4. — № 2633.

11. ПСЗ. III. — Т. 7. — № 44729а.

12. ПСЗ. III. — Т. 25. — № 26162.

13. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу (далей — РДГА), ф. 1276, воп. 1, спр. 106, арк. 54.

14. РДГА, ф. 1282, воп. 1, спр. 365, арк. 96—97.

15. РДГА, ф. 1283, воп. 1, спр. 41, арк. 44—45.

16. РДГА, ф. 1283, воп. 1, спр. 41, арк. 45—46.

17. *Рубакин Н.А.* Россия в цифрах. — С. 117.

18. Список землевладельцев Минской губернии за 1876 год. С. 1—185; РДГА, ф. 1284, воп. 190, спр. 52, ч. 5, арк. 203.

19. Список имениям Северо-Западного края, подлежащим обязательной продаже в 2-годичный срок, на основании Высочайшего повеления 10 декабря 1865 года. I. По Гродненской губернии. Вильна, 1866. — С. 6—19; РДГА, ф. 1282, воп. 1, спр. 118, арк. 120.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ